# ЗАСЛАЎЕ
## ГІСТАРЫЧНЫ КРАЯВІД



# ЖЫВАПІС
## ВІКТАРА МАРКАЎЦА

УДК [75+929 Маркавец] (084.1)
ББК 85.1
З-36

ISBN 685-6745-42-X

© Маркавец В., 2005
© Гаранская Т., тэкст, 2005
© Афармленне. ЗАТ "Юніпак", 2005

# ЗАСЛАЎЕ



2005

## ГІСТАРЫЧНЫ КРАЯВІД

## ЖЫВАПІС
## Віктара Маркаўца



*Заслаўе. Курганы над Замачкам. Панарама. 2005 г.*

**У**сяго 30—40 хвілін язды ад Мінска — і вы трапляеце ў горад з вялікай гісторыяй — старажытнае Заслаўе. Яго храмы бялюткімі, стромкімі вежамі прыкметныя здаля.

Яны хараша ўпісаліся ва ўзгоркавы ландшафт, які ўтрымлівае бачныя і нябачныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Іх назапасілася нямала болей як за тысячу гадоў.

Заслаўе ўваходзіць у лік дзесяці самых старых старажытных гарадоў Беларусі, сярод якіх ён чацвёрты пасля Полацка, Віцебска і Турава. Гучанне назваў гэтых гарадоў ахунае нас у таямніцы глыбокай гісторыі, з нетраў якой асацыятыўна паўстаюць вобразы пачынальнікаў гісторыі Беларусі — Рагвалода, Тура, Рагнеды, Ізяслава, Брачыслава, Усяслава... Слава, слава, слава — адгукаецца рэхам у нашай свядомасці.

Гісторыя горада славутая паданнем пра Рагнеду, якое было запісана ў шэрагу летапісных зводаў — Лаўрэнцьеўскім, Акадэмічным, Радзівілаўскім, Ніканаўскім, Патрыяршым, Тыпаграфскім, Уваскрэсенскім, Ільвоўскім летапісах і Маскоўскім летапісным зводзе канца XV стагоддзя. Падзеі, апісаныя ў паданні, набылі ключавое значэнне ў гісторыі некалькіх народаў, таму яно старанна перапісвалася летапісцамі на працягу некалькіх стагоддзяў. Тэксты ў дапаўняючых адзін аднаго варыянтах раскрылі шырокую карціну трагічнага лёсу і адначасова, высокай місіі Рагнеды і яе сына Ізяслава, ў адраджэнні Полацкай зямлі, у распаўсюджванні Хрысціянства на ёй.

Пытанне аб паходжанні падання займала розумы карыфеяў гістарычнай навукі



Б.А.Рыбакова, М.В.Доўнар-Запольскага, М.М.Карамзіна, М.У.Кастамарава, Д.С.Ліхачова, В.М.Тацішчава, Б.А.Раманава і іншых. Прадметам іх даследванняў было высвятленне месца напісання падання і грунт гістарычных падзеяў, які абумовіў пераўтварэнне лёсу князёўны ў легендарную гісторыю, падзеі якой на працягу многіх стагоддзяў служылі прыкладам духоўнай няскоранасці яго гераіні.

Заслаўе даследвалася археолагамі і гісторыкамі яшчэ ў XIX стагоддзі, але асаблівы ўклад у справу вывучэння гісторыі і рэканструкцыі гісторыі горада быў унесены беларускімі археолагамі XX стагоддзя. Сярод іх вызначыліся асаблівымі дасягненнямі А.М.Ляўданскі, Г.В.Штыхаў і Ю.А.Заяц. На падставе археалагічных вышукаў яны зрабілі радыкальна важныя высновы, што дапоўнілі доследы летапісных сведчанняў пра гісторыю Заслаўя. Гэта дазволіла ўнесці карэктывы ў характарыстыку і дацiроўку асноўных археалагічных і гістарычных аб'ектаў, больш шырока і дакладна інтэрпрэтаваць этапы і асаблівасці гістарычнага лёсу горада. І гэта знайшло багатае адлюстраванне ў шматлікіх навуковых публікацыях і першых кнігах пра Заслаўе.

Тым не менш, вывучэнне гісторыі Заслаўя, нават у археалагічным аспекце, нельга лічыць завершаным: шмат пытанняў засталося неасветленых паводле нераскапаных археалагічных комплексаў пасада і замчышча старажытнага горада, ды іншых аб'ектаў, а таксама больш позніх археалагічных помнікаў. Да таго ж спецыфіка публікацый археолагаў пра Заслаўе носіць пераважна інвентарна-

фактaлагічны характар. Гэта якасць характэрная кнігам і артыкулам археолагаў ва ўсім свеце, што мае аб'ектыўныя прычыны. Але яна ж правакуе напісанне дадатковых гістарычных прац з мэтай увядзення дасягненняў археалагічнай навукі, у даным выпадку — паводле вывучэння старажытнасцяў Заслаўя, — у шырокі гістарычны кантэкст.

Ад старажытнай гісторыі Заслаўя, якая была вялікай і значнай у сферы ўтварэння духоўных і матэрыяльных першаснаў нашага народа, у сучаснай матэрыяльнай культуры горада засталося, здаецца, зусім няшмат. Гэта сціплыя прыкметы мінуўшчыны:

— амаль згладжаныя ў прыродным рэльефе купкі кургановых могільнікаў;

— малазразумелыя сучаснаму чалавеку архаізмы ў мясцовых назвах — Чорная гара, рэчка Чарніца, вёска Валоўшчына і іншыя;

— вылучаныя падчас археалагічных раскопак рэчы — гліняныя гаршчэчкі, шыйныя грыўны, бранзалеты, наканечнікі стрэлаў, сякеры і да таго падобнае — для маладасведчанага чалавека сёння яны мала што здатныя распавесці пра мінуўшчыну або пераканаць у выразнай адметнасці яе хады.

Тым не менш, рэшткі побыту тых, хто жыў нават больш за тысячу год таму назад тут, дзе цяпер стаіць Заслаўе, таксама як і фальклор, як народнае мастацтва, што з'яўляецца часткай ужо сучаснай культуры беларускага народа, маюць у сабе магутны водгук пачаткаў беларускай гісторыі і этнакультуры, вартыя ўшанавання нароўні з ацалелымі храмамі, замкамі, гарадзішчамі і іншымі ВЯЛІКІМІ ПОМНІКАМІ , і таксама здатныя распавесці вельмі шмат аб тых, хто калісьці жыў на нашай зямлі.

Элементы архаікі між нашай волі грунтоўна асталяваліся ў свядомасці кожнага праз самыя разнастайныя праявы і элементы побыту — архаічныя элементы драўлянага дойлідства, формы народнага адзення і

*Заслаўе. Курганы ля Дзехнаўкі. 2005 г.*







*Заслаўе. Таямніцы рэчкі Чарніцы. 1997 г.*

абраднасці, этнаграфію і іншае, і ўжо гэтым патрабуюць да сябе асаблівай ўвагі. Таму, маючы магчымасць спазнаць іх сутнасць праз гісторыю Заслаўя і матэрыяльную культуру горада, мы маем магчымасць спазнаць сябе, вытокі ўласнай асабовасці і непаўторнасці ў гэтым свеце.

Гісторыя Заслаўя пачалася значна раней, чым пасяліліся тут Рагнеда і Ізяслаў, чым паўсталі храмы; нават раней, чым пасяліліся на правым беразе Свіслачы дзесьці ў IX стагоддзі полацкія дружыннікі, усталяваўшы тут фарпост Полацкай зямлі на гандлёвым шляху



*Заслаўе. Свіслач пад гарадзішчам. 2000 г.*



*Заслаўе. Рака Чарніца. 2005 г.*

“З варагаў у грэкі”. Сведкамі пачатковай гісторыі былі Чорная гара, рэкі Чарніца, Свіслач і шматлікія пагоркі, на якіх потым і раскінуўся горад з гарадзішчамі “Замачак”, “Вал”, пасадам і селішчамі навокал.

У даўнія часы ўсе найстаражытнейшыя гарады, як і Заслаўе, узводзіліся на гарах, бы ў той колішняй беларускай прыказцы: — “Дзе той груд, там даўней было места”. Гэта не было выпадковым. Акрамя выгоднасці размяшчэння паселішча, замка, храма на высокім месцы ў абарончым сэнсе, гэта яшчэ мела сувязь з рэлігійнымі поглядамі продкаў на набліжанасць верхніх кропак узвышшаў да Бога. Такім чынам, па меркаванні археолага Заслаўя Ю.Зайца на Чорнай гары размяшчалася капішча, да якога можна было патрапіць па “Свяшчэннай дарозе” (трасіроўка вуліцы Вялікая ў Заслаўі), прайшоўшы па мосце цераз рэчку Чарніцу.

У рэчках нашы продкі бачылі жаночы пачатак. Вада, як першавада, уяўлялася нараджаючай жыццё: — як сімвал плоднасці, яна прысутнічае ў абрадах усіх этапаў земляробчай абраднасці. З рэчкамі атаясамлівалі ўяўленні аб прыгажосці, чысціні і здароўі, і пры гэтым — іпастась вады ніколі не разглядалася толькі як знешняе яе ўздзеянне на чалавека. Існавала перакананне, што вада нясе боскую сілу дабра. Рух плыні вады ў рацэ атаясамліваўся з рухам часу.

Рака часу, аднайменная Богу часу Кронасу, — сімвалізавала першастыхію ВАДЫ, якая адчыняе шлях у царства памерлых. З таямнічымі якасцямі вады ў рацэ звязаныя ўяўленні аб яе здольнасці служыць



прыстанішчам звышнатуральных сілаў. У Мінскім раёне існаваў шэраг паданняў, паводле якіх рэчышчы пракладзены асілкамі, каторых нямала ў часы глыбокай даўніны было на гэтай зямлі.

У Заслаўі праз рэчку Чарніца ля Чорнай гары, дзе здзяйснялася трызна па памерлых, ад паселішча да пахавальнага курганового могільніка ішла “Святая дарога”. Прыклады падобных дарог —” Via sacra” — пашыраныя ў славянскай практыцы з архаічных часоў. Заслаўская Чарніца атрымала сваю назву ва ўнісон назве Чорнай гары, бо прызначэнне гэтых сакралізаваных аб’ектаў было аднолькавым. У архаічнай свядомасці нашых продкаў рака выконвала ролю падзелу паміж светам жывых і светам памерлых. Гэтым тлумачыцца назва ракі — Чарніца — якая перасякала “дарогу смерці”, і ляжала ў падножжы Чорнай гары.

Праз сакралізаваную раку абавязкова пракладваўся таксама сакралізаваны мост. У праславянскай міфалогіі матыў моста звязваўся са светам памерлых, бо існавала меркаванне, што па мосце душы памерлых трапляюць у Вырай.

У пахавальнай абраднасці мост служыў для ўстанаўлення сувязі з замагільным светам. Паводле казачнага фальклору Беларусі, гэты мост павінен быць калінавым.

Менавіта на такім мосце казачны герой сустракаецца са Змеем. Каля калінавага моста



*Заслаўе. Чорная гара. 2005 г.*



*Заслаўе. Крыніца ля  царквы. 2005 г.*

звычайна збіраюцца русалкі. Паводле дайшоўшых да нашага часу беларускіх замоваў, па Залатым калінавым мосце прыходзіць старэнькі дзядок, каб пазбавіць людзей ад няшчасцяў, а хворых — ад хваробаў.

Чорная гара не была адзінай у Заслаўі і вакол яго. Былі яшчэ Лысая гара, Змяіная гара, Прусава гара і іншыя. Назвы гэтыя захаваліся ў архіўнай дакументацыі горада (тэстаменты, судовыя дакументы, інвентары). "Каляровыя" назвы гор распаўсюджаныя на Беларусі. Вядома Чырвоная гара ў вёсцы Чашын Узадзенскага раёна Мінскай вобласці, гара Зелянец у вёсцы Клёнікі калісьці Чыжоўскай гміны, Залатыя горкі ў Мінску і ў вёсцы Залатая Горка Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці, і яшчэ шмат іншых.

Наданне магічных якасцяў каляровасці — неад'емная з'ява пракультуры беларускага народа, засведчаная ў прыказцы: — "Сам гаспадар па небе ходзіць, тры кролікі паводзіць. На сінім едзе, белым паганяе, а чырвоным, ды харошанькім, з вочка боль зганяе!"

Што датычыць чорнага колеру, — семантыка яго мае надзвычай глыбокія карані. Чорны колер не з'яўляецца ўласна колерам, а хутчэй — адмаўленнем усіх колераў. Гэты колер ёсць узгадка пра цёмнае царства, пра свет памерлых.

Назвы — Чорная гара і рака Чарніца, як і ўсё ў народнай культуры, дуалістычныя па сваёй сутнасці. З імі атаясамліваюцца розныя паняцці. Чорны колер лічыцца і колерам адраджэння.

Культ гор і горак — "чырвоных", "лысых", "чорных", — меў месца ў перыяд пераходу праславянаў да пахатнага земляробства, і быў з'явай агульначалавечай, якая атрымала па сабе праявы паўсюдна — ад гары Кронаса на Крыце да свяцілішча Светавіта на Балтыйскім моры. Гэта не быў як такавы культ саміх гор. Гэта быў факт ушанавання месцаў, дзе адбываліся абрады, што фарміравалі ўвасабленні культу Бога Неба.

Не менш  паважным, чым пра горы і горкі, у нашых продкаў было ўяўленне пра рэкі. Акрамя  адлюстравання ў сваёй прыродзе праз свядомасць архаічнага чалавека ўжо пералічаных семантычных комплексаў, рака з'яўлялася аб'ектам увасаблення гістарычных міфалагем.

Заслаўская  рэчка Княгінька  адлюстроўвае ў  сваёй  назве  пасыл  да  летапіснага падання пра Рагнеду.  Гэта ж  паданне  стала  крыніцай нараджэння  назвы  РАГНЕДЗЬ-ВОЗЕРА, якое ў мінулым стагоддзі яшчэ існавала ў ваколлях Заслаўя.

Асаблівы лёс і гісторыя ў ракі Свіслачы, што, ў адрозненне ад ужо названых заслаўскіх рэчак, мела больш шырокае прызначэнне як водны шлях, які існаваў раней, чым сухапутныя шляхі, і даваў магчымасць зносінаў людзям, што жылі  на вялікіх адлегласцях паміж сабой. Вось як вытлумачвае значэнне такіх рэк на Беларусі знакаміты беларускі географ Аркадзь Смоліч:



"У стардаўнія часы ўвесь наш край быў пакрыты непраходнымі балоцістымі лясамі і пушчамі. Вельмі многа трэба было патраціць часу і працы, каб праз тую нетру пралажыць хоць якую-небудзь дарожку. Дзеля гэтага людзі пераязжалі з аднаго месца ў другое па рэках, і навогул — вадою. Гэта была лёгкая і хуткая дарога. Ня йначай жа як па рэках перавозілі ўсе тавары. На берагах рэк будавалі месцы, а ў іх на рынках ішоў гандаль, мена тавараў. Можна сказаць, што ўсё жыццё нашых продкаў адбывалася каля рэк і на рэках, на гэтых вадзяных шляхах".

Рэкі сталі асноўнымі шляхамі раздзялення і месцамі гаспадарчай дзейнасці ў племянную эпоху. З канца I-га, у пачатку II-га тысячагоддзяў пачалі асвойвацца водападзелы. Заслаў таксама знаходзіўся на тэрыторыі аднаго з участкаў водападзела Дняпра і Нёмана. Тут вярхоўе Свіслачы падступала да вярхоўяў Ушы і Ісланчы, па якіх пралягаў шлях у землі літоўскіх плямёнаў і да Балтыйскага мора. Пасланцы  полацкіх  князёў на празаслаўскай тэрыторыі не толькі ахоўвалі паўднёва-заходнія межы Полацкай зямлі, здзяйснялі ўладу цэнтра над мясцовым насельніцтвам, але і кантралявалі кавалак воднага шляху "З ВАРАГАЎ У ГРЭКІ".

Усе рэкі пачынаюцца з крыніц. Заслаўе, што было заснаванае больш тысячы гадоў таму назад у вярхоўі Свіслачы, паўстала ў пацеркавым атачэнні крыніцаў як наўкол горада, так і ў яго ўнутранай структуры. Празаслаўцы шанавалі крыніцы як святыні. Ушанаванне крыніцаў пачалося яшчэ з каменнага веку. Яно здзяйснялася праз паднашэнне ім ахвяраў і спраўленне адмысловых абрадавых дзеянняў, што пазней



*Заслаўе. Хрост на Чарніцы. 1998 г.*



*Заслаўе. Старое дрэва ля Чарніцы. 2005 г.*

сталі прымяркоўвацца да каляндарнага цыклу. Напрыклад, у пятніцу, на дзевятым або дзесятым тыдні пасля Вялікдня (на Пятроўку) крыніцы свяцілі, у тым ліку калодзежы, якія ў пэўным сэнсе атаясамліваліся з крыніцамі.

Сакральнае значэнне крыніц звязана з культам вады. У сувязі з гэтым ім прыпісваўся апаладняючы моц. Такія крыніцы цяклі з падножжа гор і гарадзішчаў. Да такіх належыць ацалелая ў Заслаўі па сёняшні дзень крыніца пад гарадзішчам "Вал".

Пра крыніцу і яе лекавыя асаблівасці знаходзім сведчанні ў архіўных матэрыялах гісторыі горада і дзённікавых запісах Ястрэмскага, які на пачатку XX стагоддзя жыў у Заслаўі, у былым маёнтку Пшаздзецкіх. Гэта крыніца мела назву Сіняя. Зусім верагодна, што і гара, пад якой яна прабівалася, называлася калісьці Сіняй гарой, падобна таму як у Заслаўі Чорнай называлася рака пад ЧОРНАЙ гарой. Аналагі мелі месца і ў іншых рэгіёнах Беларусі. Напрыклад, каля вёскі Сіняя Гара Валожынскага раёна на высокай гары пад назвай Сіняя цякла Сіняя крыніца.

У беларускім фальклоры прасочваецца сувязь паміж апаладняючым моцам крыніц і фальклорнай гераіняй Кацярынай "Багатыркай", язычкім прататыпам якой была апякунка шлюбу і парадзіх, верагодна, жаночая пара ВЯЛІСА. Характарызавалася гэтая багіня валатоўскім ростам і нядзюжым моцам. Яна ж мела дачыненні да жывёльнага свету. Такія якасці надаваліся крыніцы, што зусім нядаўна цякла ў Заслаўі ля дарогі паміж Дзехнаўкай і Варонкай. Шэраг крыніцаў надзяляецца цудадзейнымі якасцямі ў сувязі з іх прыналежнасцю да Святых асобаў. Такой ў Заслаўі лічылася княгіня Рагнеда, што была хрысціянкай, і ў хрысціянскай веры выхавала сына Ізяслава. Ад мясцовых жыхароў запісана паданне аб тым, што яна на рацэ Чарніца адкапала крыніцу, і з тых часоў крынічка стала цудадзейнай. Але крыніца надзяляе сваімі цудамі толькі тых, хто старанна моліцца ля яе, і пасля, набраўшы святой вадзіцы, шчыра ёй дзякуе. У 1993 годзе, у часы святкавання 1000 годдзя Полацкай епархіі, над гэтай крыніцай была ўстаноўленая капліца, і на водахрост да яе збіраецца шмат людзей не толькі з Заслаўя і яго ваколіц, але і з іншых, часам вельмі далёкіх мясцінаў.

Яшчэ не так даўно ў Заслаўі было шмат вялікіх дрэў, якіх аднаму чалавеку па перыметры ахапіць было не пад сілу. Такія былі на Чорнай гары, на перасячэнні вуліцы Вялікай і ракі Чарніцы, і яшчэ шмат дзе. А зараз засталося ўсяго некалькі ля мастка на лузе ля ракі Чарніцы. Старадаўнія дрэвы, нібы волаты-ахоўнікі, прыўносілі ў жыццё і рытмы старажытнага горада пачуццё раўнавагі і быццам бы застыласці часу.

Рамантычныя, казачныя настроі навявалі назіранні за стайкамі птушак, што гняздзіліся на старых дрэвах, і сваімі чароўнымі галасамі нібы прамаўлялі нешта таемнае, пачутае ад дрэў-старыжылаў: штосьці такое, што ўжо не памятаюць і не ведаюць людзі, а дрэвы яшчэ бачылі тут, ў Заслаўі, на сваім вяку.

Вядучы беларускі археолаг Георгій Штыхаў сцвярджае, што Заслаўскі кургановы могільнік самы буйны на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Даследчык Заслаўя Юрый Заяц мяркуе, што ў горадзе і яго аколіцах, было, з улікам масавых зносаў курганоў падчас будаўнічых работ, каля



паўтары тысячы пахаванняў X—XII стагоддзяў. Комплекс з дванаццаці кургановых груп у Заслаўі сваёй маштабнасцю сведчыць і аб тым, што тут знаходзіўся адзін з буйнейшых волакаў на гандлёвым шляху "з варагаў у грэкі". Калі задумацца, то рэшткі нашых продкаў ляжаць у зямлі заслаўскай ледзь не на кожным кроку. У гэтай сувязі трапным успрымаецца верш аўтара выстаўкі "Заслаўе. Гістарычны краявід", мастака Віктара Маркаўца — "Заслаўскія прывіды":

*Як толькі дзень чарговы заціхае,*
*Прамень апошні вежу пакідае —*

*Княгіньку-рэчку туманы схаваюць...*
*Наўкол Заслаўя курганы ўздыхаюць...*

*Зямля ледзь чутна ўздрыганецца —*
*Далёкі звон там раздаецца.*

*Сноў доўгіх чары страсянуўшы,*
*Паўстануць волаты з вякоў мінуўшых...*

*Павольна крочуць над мурамі*
*Пацïху звонячы мечамі,*

*Зноў ворагаў гатовыя сустрэць,*
*І здраду ў цемры разглядзець.*

*На Замчышча высокае сыйдуцца,*
*Штандары ў небе ўскалыхнуцца...*

*А першы певень заспявае —*
*Прывід на Замчышчы знікае.*

*Звон дзіўны толькі застаецца —*
*Кроў продкаў б'ецца ў нашых сэрцах.*

Шмат гадоў жывапісец хадзіў па Заслаўскай зямлі, углядаўся ў яе помнікі, прыслухоўваўся да гукаў яе дыхання, любаваўся пластыкай яе ландшафтаў.

Нарэшце Віктар Маркавец прадстаўляе грамадскасці выстаўку "Заслаўе. Гістарычны краявід", якую вырашана экспанаваць у горадзе ў дні святкавання 1020-х угодкаў.



*Заслаўе. Курганы ля дарогі на Мінск. Хведзькаў крыж. 2005 г.*



*Заслаўе. Краявід з Дзехнаўкі. 2001 г.*

Экспазіцыі папярэднічаў шэраг выставак творцы, присвечаных гісторыі горада — "Ілюзіі і рэаліі магнатаў Пшаздзецкіх", "Заслаўе Глябовічаў" і іншых, якія распавядалі гледачу пра канкрэтныя гістарычныя перыяды з жыцця горада, уваскрашаючы вобразы былых уладароў Заслаўя.

Новая выстаўка абстрагуецца ад канкрэтнай гісторыі. Аўтар робіць спробу паглыбіцца ў філасофію гістарычнага ландшафту, раскрыць завесы "тэатра прыроды", што выглядае годным атачэннем помнікам дойлідства, гарадзішчам і курганам Заслаўя.

Тысячы разоў бачаныя заслаўчанамі краявіды роднага горада ў творах Маркаўца ахунаюцца вэлюмам рамантычнага погляду, і набываюць нейкае асабліва выразнае, працятае як бы самой вечнасцю гучанне. Колеры заслаўскіх палёў і лугоў на палотнах мастака напаўняюцца чароўнай магіяй, што прыцягвае погляды, вабіць падыйсці да твораў, каб наталіцца ўнікальнай прыгажосцю і адметнасцю гістарычнай мясціны.

Заслаўю прысвячалі свае палотны многія беларускія мастакі. І, ў пераважнай большасці гэта былі краявіды з выявай Спаса-Праабражэнскай царквы — помніка гісторыі і дойлідства Беларусі XVI стагоддзя. Віктар Маркавец на сваёй выстаўцы таксама не мінае гэтага сюжэта, хаця ў інтэрпрэтацыях яго пазбягае лабавых рашэнняў кампазіцый. І ўсё ж адным з галоўным дасягненняў новай выстаўкі жывапісца, прысечанай Заслаўю, з'яўляецца не толькі надзвычай рамантызаваны вобраз храма ў карціне "Цішыня гісторыі" (2005 г., на першай старонцы вокладкі), але і "партрэты" раней нікім не апетых мовай фарбаў кургановых могільнікаў, што з'яўляюцца адными з самых унікальных



помнікаў не толькі Заслаўя, але і ўсёй старажытнай беларускай гісторыі (карціны "Курганы ля Дзехнаўкі" 2005г., "Курганы ля дарогі на Мінск.Хведзькаў Крыж" 2005 г.).

У манументальных панарамах горада, напісаных Вітарам Маркаўцом з боку кургановага могільніка ля гарадзішча "Замачак" (карціна "Заслаўе. Курганы пад Замачкам". Панарама. 2005 г.), і з Дзехнаўскіх пагоркаў (" Заслаўе. Панарама з Дзехнаўскай гары" 2005 г.) распавядаецца пра хроніку рэалій сучаснага горада, якому старажытныя комплексы курганоў, гарадзішчаў, рэчак і дрэў, помнікаў дойлідства надаюць нейкай асаблівай энергетыкі прыцягальнасці і прывабнасці. Углядаючыся ў іх, патанаеш у прасторы гістарычнай спадчыны — часам занядбанай, недагледжанай, і ўсё ж — такой велічнай і значнай!

Асаблівую ўвагу ў комплексе палотнаў выстаўкі "Заслаўе. Гістарычны краявід" мастак надае вобразам крыніц і рэчак, старых дрэваў, старонкам побытавага жыцця старажытных вуліц горада — тым момантам і з'явам жыцця Заслаўя, што звычайна не трапляюць у поле зроку творчых асобаў, маючы імідж шэраговых рэчаў побыту жыцця (карціны "Рака Чарніца" 2005 г. "Крыніца ля царквы" 2005 г., "Заслаўе. Старое дрэва ля Чарніцы" 2005 г.,"Хаткі па вуліцы Вялікай" 1997 г.). Бадай што толькі беларускія жывапісцы Вітольд Бялыніцкі-Біруля і Фердынанд Рушчыц здатныя былі ўзводзіць падобную "шэраговасць" у статус велічных знакаў жыцця — запамінальных і эфектных ва ўласнай выразнасці.

Адметнай рысай выстаўкі стала ўвядзенне мастаком чаргавання маштабных модуляў погляду на гістарычнае Заслаўе. Ад карціны да карціны мы лунаем то ў мікра-, то у макра-



*Заслаўе. Хаткі на вуліцы Вялікай. 1997 г.*



*Заслаўе. Панарама з Дзехнаўскай гары. 2005 г.*



*Заслаўе. Лірычны краявід. 1997 г.*

будовы рэчаіснасці, разглядаючы то вялізныя панарамы горада, то амаль што не мініяцюрныя сюжэты эпізодаў сакральных святаў (акварэльная кампазіцыя “Купалле” 1980 г., сюжэтная карціна “Заслаўе. Хрост на Чарніцы” 1995 г.). Пачуццёвыя вібрацыі прымушаюць гледача настройвацца на рытмы жыцця старажытнага горада, пранікаючыся яго адметнасцямі, імпульсамі, праявамі архаікі.

Аўтар выстаўкі стварыў жывапісны вобраз заслаўскага касцёла. Гэта таксама прыкметная з’ява экспазіцыі.

Гістарычны краявід ужо не аднойчы станавіўся аб’ектам ўвагі жывапісца Віктара Маркаўца. У мастацтве Беларусі вядомыя яго карціны “Лагойск. Руіны храма” (1979), “Віцебск XVI стагоддзе” (1986), “ Стары



Мінск” (1981), “Панарама Нясвіжа” (1991), краявіды беларускай Вільні (2003), “Камяні пад Докшыцамі” (1991) і іншыя.

Большасць з названых твораў набыта музеямі і галерэямі.

Ужо гэта гаворыць пра іх значнасць.

У практыцы мастака ў 1992 годзе была выстаўка “Гістарычныя імпрэсіі”, што экспанавалася ў Надвіслянскім музеі горада Казімеж Дольны ў Польшы. У гэтай выстаўцы жывапісец імкнуўся спраўдзіць праз мастацкія вобразы пераклічку гістарычных знакавых сістэм розных культур — беларускай і польскай — каб выявіць агульнае, і абазначыць індывідуальнае.

У 1992 годзе ў Раджарскім універсітэце ЗША адбылася выстаўка маляваных дываноў



*Заслаўе. Рытмы мястэчка. 1998 г.*



*Заслаўе. Касцёл Св. Марыі. 2005 г.*

Віктара Маркаўца, што адлюстравала ў манументальных вобразах выявы славутых помнікаў дойлідства Беларусі: пададзеныя праз спалучэнне з лірычным кветкавым акаймленнем зёлкамі з лугоў і палёў Беларусі, храмы і замкі выглядалі асабліва ўрачыстымі і запамінальнымі.

Калекцыя палотнаў жывапісца пад выставачным дэвізам "Заслаўе. Гістарычны краявід" — новае слова ў творчасці аўтара паводле гістарычнай тэматыкі, паводле асэнсавання гісторыі Заслаўя праз маўклівыя сведчанні помнікаў і краявідаў — артыфактаў горада, новае слова ў мастацка-вобразнай, канцэптуальнай інтэрпрэтацыі жыцця горада з тысячагадовай гісторыяй, убачанай аўтарам з'явай касмаганічнага парадку.

*Таццяна Гаранская*



## Спіс твораў

1. **Цішыня гісторыі**
   2005 г., палатно, алей , 93 х 105 см. (першая старонка вокладкі)
2. **Купалле**
   1980 г., папера, акварэль, 21 х 27 см. (другая старонка вокладкі)
3. **Заслаўе. Курганы пад Замачкам**
   2005 г., палатно, алей, 100 х 280 см
4. **Заслаўе. Курганы ля Дзехнаўкі**
   2005 г., палатно, алей, 100 х 280 см
5. **Заслаўе. Таямніцы рэчкі Чарніцы**
   1997 г., палатно, алей, 26 х 48 см
6. **Заслаўе. Рака Чарніца**
   2005 г., палатно, алей, 75 х 100см
7. **Заслаўе. Чорная гара**
   2005 г., палатно, алей, 58 х 65 см
8. **Заслаўе. Крыніца ля царквы**
   2005 г., палатно, алей, 95 х 68 см
9. **Заслаўе. Хрост на Чарніцы**
   1998 г., палатно, алей, 28 х 40 см
10. **Заслаўе. Старое дрэва ля Чарніцы**
    2005 г., картон, алей, 99 х 99 см
11. **Заслаўе. Курганы ля дарогі на Мінск Хведзькаў крыж**
    2005 г., палатно, алей, 70 х 120 см
12. **Заслаўе. Краявід з Дзехнаўкі**
    2001г., палатно, алей, 40 х 53 см
13. **Заслаўе. Хаткі на вуліцы Вялікай**
    1997 г., палатно, алей, 38 х 58 см
14. **Заслаўе. Панарама з Дзехнаўскай гары**
    2005 г., палатно, алей, 100 х 280 см
15. **Заслаўе. Лірычны краявід**
    1997 г., палатно, алей, 50 х 80 см
16. **Заслаўе. Рытмы мястэчка**
    1998 г., палатно, алей, 50 х50 см
17. **Заслаўе. Касцёл Св. Марыі**
    2005 г., палатно, алей. 96 х 150 см

Падпісана да друку 11.08.05 Наклад 3000 ас. Заказ 547. Выдавецтва і друкарня ЗАТ "Юніпак"
ЛИ № 02330/0056911 ад 01.04.2004. ЛП № 02330/0148762 от 30.04.2004.
Вул. Кастрычніцкая, 19, 220030, Рэспубліка Беларусь
Тэл./факс: 227-54-87, 210-43-34, 227-13-37



## ВІКТАР МАРКАВЕЦ

Нарадзіўся 5 жніўня 1947 года ў горадзе Докшыцы Віцебскай вобласці. Атрымаў адукацыю жывапісца ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце (цяпер — Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў).

З 1971 года — ўдзельнік Рэспубліканскіх мастацкіх выставак.

Аўтар чатырнаццаці персанальных выставак на радзіме і за яе межамі.

За серыю палотнаў "Свята ў Докшыцах", "Дзед Алесь і бабка Марылька", "Купалле" ў 1980 годзе ўзнагароджаны дзяржаўнай прэміяй імя Ленінскага камсамола Беларусі. Майстар гістарычнага жывапісу і тэматычнай карціны, краявіднага жывапісу, партрэта і нацюрморта. Шэраг персанальных выставак, пачынаючы з 1991 года, прысвяціў гісторыі старажытнага Заслаўя. Сябра беларускага саюза мастакоў. Старшыня грамадскага аб'яднання "Мастак", у якое ўваходзяць мастакі горада Заслаўе. Жыве і працуе ў Заслаўі.

ISBN 685-6745-42-7